Салідарнасць

Незалежнасць

кааліцыя #9

# Латушка

ціск АДКАЗНАСЦЬ

Рух

# ЗА СВАБОДУ

Знешняя палітыка Дыяспара

БУДУЧЫНЯ

---

# ПРАГРАМА КААЛІЦЫІ

Каманда Латушка і Рух «За Свабоду»

Мы — адказная палітычная сіла, якая працуе па прынятай праграме і дасягае канкрэтных вынікаў. Мы не займаемся скандаламі і папулізмам – мы умеем дамаўляцца, будаваць кааліцыі і паслядоўна прасоўваць рашэнні, якія дапамагаюць беларусам.

Для нас Каардынацыйная Рада — гэта не пляцоўка для ўнутранай барацьбы паміж дэмакратычнымі сіламі. Мы бачым у ёй палітычны інстытут, які павінен прадстаўляць інтарэсы беларусаў і працаваць дзеля рэальных зменаў у краіне.

За апошнія гады мы сістэмна назапашвалі міжнародны і санкцыйны рэсурс, дамагаліся рашэнняў, якія ўзмацняюць ціск на рэжым, і адначасова дапамагалі людзям. Мы падтрымлівалі беларусаў, якія былі вымушаныя пакінуць краіну, дапамагалі атрымліваць візы і міжнародную абарону, абаранялі інтарэсы палітвязняў і іх сем'яў, падтрымлівалі культурныя ініцыятывы і беларускую ідэнтычнасць. **Мы не спыняемся (не перагортываем старонкі) і будзем далей актыўна працягваць гэтую працу.**

коаліцыя #9
Латушка
Рух ЗА СВАБОДУ

# НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ

1

## Забеспячэнне незалежнасці і суверэнітэту Рэспублікі Беларусь

Стварэнне умоў дзеля захавання беларускай дзяржавы і нацыі, супрацьстаянне спробам размывання суверэнітэту Беларусі, які знаходзіцца пад пагрозай з боку Расіі, забеспячэнне ўліку нацыянальных інтарэсаў пры прыняцці рашэнняў на міжнародным узроўні.

2

## Падтрымка беларускай мовы і нацыянальнага адраджэння.

Пашырэнне выкарыстання беларускай мовы, развіццё і падтрымка культурных і адукацыйных ініцыятыў, накіраваных на ўмацаванне беларускай нацыянальнай ідэнтычнасці.

# НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ

3

## Беларусы — не рэжым

Прасоўванне на міжнароднай арэне пазіцыі аб важнасці размежавання беларускага народу і рэжыму Лукашэнкі, каб нашыя партнёры павялічвалі падтрымку беларускаму грамадству, працягваючы абмежаванні ў адносінах да рэжыму.

4

## Супрацьдзеянне «рускаму міру»

Супрацьдзеянне расійскай імперскай ідэалогіі і пагрозам «рускага міру» для беларускай дзяржаўнасці.

# НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ

5

## Падтрымка незалежных медыяў

Лабіраванне міжнароднай падтрымкі беларускіх незалежных медыяў і блогераў.

6

## Падрыхтоўка прафесіяналаў

Развіццё праграм адукацыі, стажыровак і падрыхтоўкі будучых кадраў для дэмакратычнай Беларусі.

# НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ

7

## Падтрымка бізнеса

Прыватны сектар — аснова суверэнітэту краіны і дэмакратычнага грамадства. Падтрымка беларускага бізнесу у выгнанні як асновы будучай эканомікі дэмакратычнай Беларусі.

# ЗНЕШНЯЯ ПАЛІТЫКА

1

## Нічога пра Беларусь без беларусаў

Адстойванне нацыянальных інтарэсаў Беларусі перад міжнароднымі партнёрамі, зыходзячы з падыходу “нічога пра нас без нас”.

2

## Еўрапейскі выбар Беларусі

Прасоўванне канцэпцыі прыналежнасці Беларусі да агульнай сям’і народаў Еўропы і еўрапейскай будучыні для нашай краіны. Забеспячэнне палітычнай падтрымкі еўрапейскаму выбару беларускага народа і адкрытасці Еўропы для беларусаў.

# ЗНЕШНЯЯ ПАЛІТЫКА

3

## Падтрымка Украіны

Палітычная і дыпламатычная падтрымка Украіны. Падтрымка расследвання злачынстваў супраць Украіны. Павышэнне ўзроўню палітычных кантактаў, развіццё супрацоўніцтва з Вярхоўнай Радай Украіны.

4

## Міжпарламенцкае супрацоўніцтва

Далейшае развіццё супрацоўніцтва з парламентамі і міжнароднымі парламенцкімі структурамі для ўзмацнення знешнепалітычнай суб’ектнасці дэмакратычнага руху. Супрацоўніцтва з Еўрапейскім парламентам. Забеспячэнне працы дэлегацый Каардынацыйнай Рады ў Парламенцкай асамблеі Савета Еўропы, Кангрэсе мясцовых і рэгіянальных органаў улады Савета Еўропы, Парламенцкай асамблеі Еўранэст, Парламенцкай асамблеі АБСЕ.

# САЛІДАРНАСЦЬ

1

## Дапамога беларусам у выгнанні

Палітычная падтрымка ініцыятыў, якія дапамагаюць беларусам, вымушаным пакідаць краіну праз палітычны пераслед, у тым ліку пенсіянерам і ветеранскім арганізацыям, якія займаюцца падтрымкай былых і дзеючых беларускіх дабраахвотнікаў, а таксама іх сямей.

2

## Вызваленне і падтрымка палітзняволеных

Спрыянне міжнародным партнёрам у вызваленні ўсіх палітвязняў у Беларусі і палітычная падтрымка праграм рэабілітацыі, дапамогі і інтэграцыі для былых палітвязняў і членаў іх сямей.

# САЛІДАРНАСЦЬ

3

## Легалізацыя беларусаў за мяжой

Садзейнічанне прыняццю заканадаўчых і выканаўчых рашэнняў міжнароднымі партнёрамі для легалізацыі беларусаў. Дапамога ў атрыманні гуманітарных візаў асобам, якія знаходзяцца пад пераследам у Беларусі.

4

## Спрыянне мабільнасці грамадзян Беларусі

Прасоўванне ініцыятыў па спрашчэнні візавага рэжыму і паляпшэнні памежнага руху ў дачыненні да беларусаў. Лабіраванне запуску пасажырскага чыгуначнага злучэння Беларусі з Польшчай і Літвой.

# АДКАЗНАСЦЬ

1

## Злачынствы супраць чалавечнасці

Прасоўванне пытання падтрымкі краінамі-удзельніцамі Рымскага Статута расследвання Офісам пракурора Міжнароднага крымінальнага суда злачынстваў супраць чалавечнасці ў адносінах да беларускага народу, здейсненных прадстаўнікамі рэжыму Лукашенкі.

2

## Спецтрыбунал за злачынства агрэсіі

Палітычная падтрымка працэсу стварэння Спецыяльнага трыбунала за злачынства агрэсіі супраць Украіны у межах Савета Еўропы, а таксама адказнасці вышэйшага ваенна-палітычнага кіраўніцтва рэжыму Лукашэнкі за здзяйсненне злачынства агрэсіі.

# АДКАЗНАСЦЬ

3

## Злачынствы супраць украінскіх дзяцей

Палітычнае прасоўванне пытання адказнасці прадстаўнікоў рэжыму Лукашэнкі за ваенныя злачынствы супраць украінскіх дзяцей, незаконна вывезеных у Беларусь з часова акупаваных Расіяй тэрыторый Украіны.

4

## Універсальная юрысдыкцыя

Супраца з парламентарыямі краін-партнёраў дзеля стварэння умоў па расследванню злачынстваў прадстаўнікоў рэжыму Лукашэнкі ў межах нацыяльных сістэм правасуддзя на падставе універсальнай юрысдыкцыі.

# АДКАЗНАСЦЬ

5

## Ціск з мэтай патрабавання рэальных зменаў

1. Рэалізацыя стратэгіі “камунікацыя ва ўмовах санкцыйнага ціску” для дасягнення зменаў унутранай рэпрэсіўнай і знешняй агрэсіўнай палітыкі рэжыму Лукашэнкі.
2. Падтрымка падыходу аб адмене ці прыпыненні санкцый пасля рэальнай, а не імітацыйнай змены палітыкі.
3. Прасоўванне персанальных і эканамічных санкцый пры адсутнасці зменаў у палітыцы рэжыму.

# СВАБОДА

## Пераадоленне палітычнага крызісу

1. Падтрымка ініцыятывы нацыянальнага дыялогу праз інструмент Круглага стала паміж дэмакратычнымі сіламі і прадстаўнікамі рэжыму. Узамадзенянне з міжнароднымі партнёрамі па выкарыстанні дадзенага інструмента ў якасці прыярытэтнага для змены сітуацыі ў Беларусі і выхаду з глыбокага палітычнага крызісу. Наша галоўная мэта - дэмакратычная незалежная Беларусь без дыктатуры.

2. Прасоўванне ўдзелу Каардынацыйнай Рады ў перамовах па выхадзе з палітычнага крызісу.

Мы перакананыя, што міжнародная падтрымка і ціск дадуць чаканыя вынікі. Таму мы прапануем інструмент выхаду з палітычнага крызісу – Круглы стол для будучыні Беларусі. Калі Лукашэнка і яго атачэнне не гатовыя да такога дыялогу, мы будзем лабіраваць узмацненне міжнароднага ціску да таго часу, пакуль не з’явяцца ўмовы для сапраўдных перамоваў з удзелам прадстаўнічых органаў беларскіх дэмакратычных сіл — Каардынацыйнай Рады і Аб’яднанага Пераходнага Кабінета.

У нас ёсць вопыт, ёсць каманда і ёсць стратэгія. Мы ідзём працаваць.

**ГАЛАСУЙЦЕ ЗА НАС!**

Салідарнасць

Незалежнасць

кааліцыя #9

Латушка

Рух

ціск

АДКАЗНАСЦЬ

ЗА СВАБОДУ

Знешняя палітыка

Дыяспара

БУДУЧЫНЯ

## НЕЗАЛЕЖНАСЦЬ! АДКАЗНАСЦЬ! СВАБОДА!

## Жыве Беларусь!